# РАМАН СЯМЁНАВІЧ ЧАБАТАРОЎ

## (Да 90-годдзя з дня нараджэння)



Раман Сямёнавіч Чабатароў — адзін з выдатнейшых паразітолагаў нашага часу, вядомы сярод айчынных і замежных вучоных сваёй высокай эрудыцыяй і сапраўды акадэмічнымі ведамі ў вобласці паразіталогіі. Як чалавек ён адрозніваўся дабратой, сціпласцю, нястомнай працаздольнасцю, пастаянным імкненнем да пазнання ўсяго новага, прагрэсіўнага. Кола яго навуковых інтарэсаў было вельмі шырокім. Цяжка нават сабе ўявіць хоць адзін буйны накірунак даследаванняў у паразіталогіі, куды б не ўнёс навуковы ўклад акадэмік Р. С. Чабатароў. Таму ён з'яўляецца прызнаным аўтарытэтам ў галіне паразіталогіі сярод вучоных, а таксама практычных медыцынскіх і ветэрынарных спецыялістаў.

Р. С. Чабатароў нарадзіўся 15 кастрычніка 1905 г. у в. Старынка Вушацкага раёна Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і. Ён рана пачаў працаваць і толькі ў 13 гадоў змог пачаць вучыцца ў школе. Скончыўшы сярэднюю школу ў 1925 г., ён паступіў у Віцебскі ветэрынарны інстытут. Яшчэ ў час вучобы ў інстытуце Р. С. Чабатароў пачаў захапляцца вывучэннем паразітарных хваробаў жывёл.

Пасля заканчэння інстытута яму як выдатніку вучобы прапануюць пасаду ардынатара клінікі інвазійных хваробаў жывёл, а ў 1931 г. яго пераводзяць на пасаду асістэнта кафедры паразіталогіі і інвазійных хваробаў Віцебскага ветэрынарнага інстытута. З гэтага часу фактычна і пачынаюцца яго навукова-педагагічная дзейнасць і станаўленне як вучонага-паразітолага.

У гэты перыяд ён вывучае эфектыўнасць розных прэпаратаў пры паразітарных хваробах жывёл, у прыватнасці ўжыванне серавугляроду пры параскарыдозе коней, праводзіць навуковыя даследаванні па трэматадозах жвачных, анхацэркозе і параскарыдозе коней, піраплазмідозах [1—3].

Вынікі вывучэння целязіёзу буйной рагатай жывёлы, цэнурозу авечак, піраплазмідозаў жывёл, у тым ліку па зімовай заклешчаванасці буйной рагатай жывёлы іксодавымі кляшчамі, не страцілі актуальнасці і ў наш час.

У 1932—1933 гг. Р. С. Чабатароў знаходзіцца ў камандзіроўцы ў Ленінградзе, дзе пад кіраўніцтвам акадэміка Е. Н. Паўлоўскага ў Ваенна-медыцынскай акадэміі вывучае арахна-энтамалогію, а ў Ветэры-

нарным інстытуце пад кіраўніцтвам прафесара В. Л. Якімава ўдасканальвае свае веды па протазаалогіі. Пасля вучобы ў Ленінградзе Раман Сямёнавіч пераходзіць на пасаду старшага асістэнта кафедры паразіталогіі і інвазійных хваробаў Чкалаўскага сельскагаспадарчага інстытута і адначасова — навуковага супрацоўніка аддзела паразіталогіі Чкалаўскага навукова-даследчага медыцынскага інстытута.

У 1935 г. Р. С. Чабатароў па конкурсе выбіраецца на пасаду загадчыка кафедры паразіталогіі і інвазійных хваробаў Кіеўскага ветэрынарнага інстытута, дзе працуе да пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Гэты перыяд быў вельмі плённым для навуковых даследаванняў Р. С. Чабатарова. Ён вывучае некаторыя пытанні патагенезу пры гельмінтозах жывёл, даследуе ўзбуджальнікаў піраплазмідозаў, абагульняе сабраныя матэрыялы па эпізааталогіі дыктыякаулёзу, макракантарынхозу, вызначае і абгрунтоўвае магчымасць заражэння цялят неааскарыдамі. Адным з першых ён вывучае пытанні праяўлення алергіі пры гельмінтозах свойскай жывёлы. Асобным накірункам даследаванняў Р. С. Чабатарова ў гэты перыяд з'яўляецца вывучэнне распаўсюджання каросты ў жывёл, распрацоўка сродкаў яе лячэння і прафілактыкі. Ён звяртае ўвагу на магчымасць заражэння чалавека каростай ад свойскай жывёлы. У 1943 г. у Свярдлоўску Р. С. Чабатароў арганізаваў прамысловую вытворчасць фенатыязіну. Па матэрыялах праведзеных даследаванняў у 1937 г. у Маскоўскім зооветэрынарным інстытуце Р. С. Чабатароў абараніў кандыдацкую дысертацыю па тэме «Зімовае заклешчванне буйной рагатай жывёлы» [4].

У ліпені 1941 г. Раман Сямёнавіч прызначаецца начальнікам добраахвотніцкага санітарнага атрада і знаходзіцца на Паўднёва-Заходнім фронце. Аднак ужо ў жніўні яго адклікаюць з фронта для ўдзелу ў эвакуацыі ў глыб краіны Кіеўскага ветэрынарнага інстытута. У верасні гэтага ж года ён прызначаецца загадчыкам кафедры паразіталогіі і інвазійных хваробаў, а потым — намеснікам дырэктара Свярдлоўскага сельскагаспадарчага інстытута, дзе працуе да 1944 г.

Ацэньваючы даследаванні Р. С. Чабатарова ў даваенны перыяд, акадэмік К. І. Скрабін пісаў пра яго, што гэта «...вельмі здольны работнік, вялікі энтузіаст сваёй справы...»

У 1942 г. у Казанскім ветэрынарным інстытуце Р. С. Чабатароў абараніў доктарскую дысертацыю па праблеме піраплазмозу коней, а ў 1944 г. яму было прысвоена навуковае званне прафесара.

Пасля вызвалення Кіева Р. С. Чабатароў па выкліку ўрада Украіны вяртаецца ў Кіеўскі ветэрынарны інстытут, дзе зноў узначальвае кафедру паразіталогіі і інвазійных хваробаў, а праз кароткі час прызначаецца дырэктарам і загадчыкам кафедры паразіталогіі Львоўскага ветэрынарнага інстытута, дзе працуе да 1949 г. А потым зноў вяртаецца ў Кіеў у Інстытут заалогіі, чытае курс паразіталогіі і інвазійных хваробаў у ветэрынарным інстытуце.

У гэты перыяд навуковыя даследаванні вучонага накіраваны на вывучэнне асацыятыўных хваробаў жывёл. У прыватнасці, ён вывучае асаблівасці цячэння піраплазмозу ў хворых на бруцэлёз коней, уплыў параскарыдозу і странгіладозу на цячэнне і зыход піраплазмозу коней, уплыў піраплазмозу коней на цячэнне інфекцыйнай анеміі. Вывучаюцца эфектыўнасць і новыя спосабы выкарыстання шэрагу супрацьпаразітарных прэпаратаў — чатыроххлорыстага вугляроду, фенатыязіну, мыш'яковістага ангідрыду, серы і інш.

Адной з найбольш яркіх прац Р. С. Чабатарова ў гэты перыяд, бясспрэчна, з'яўляецца даследаванне па ўжыванні мыш'яковістых злучэнняў супраць кляшчоў — пераносчыкаў піраплазмідозаў жвачных. Распрацоўваюцца таксама спосабы выкарыстання сапрапелю пры паразітозах страўнікава-кішачнага тракту свіней. Шэраг даследаванняў прысвечаны вывучэнню патагенезу піраплазмозу, распрацоўцы методыкі дэрмалярваскапіі анхацэркозу, вывучаецца праблема дэвастацыі пара-

зітозаў коней, а таксама магчымасць пераносу кароставымі кляшчамі вірусу інфекцыйнай анеміі коней [7]. У гэты час ім напісаны раздзел «Інвазійныя хваробы» ў даведніку «У дапамогу вайсковаму ветурачу» [5] і манаграфія «Піраплазмоз коней» [6]. У гэтай манаграфіі аўтар абагульніў даныя айчыннай і замежнай літаратуры, дапоўніў іх матэрыяламі ўласных даследаванняў. У ёй глыбока асветлены пытанні патагенезу, клінікі, дыягностыкі і тэрапіі піраплазмозу коней.

За перыяд працы ў Львоўскім і Кіеўскім ветэрынарных інстытутах, а таксама ў Інстытуце заалогіі АН Украіны Р. С. Чабатароў праводзіць шэраг арыгінальных даследаванняў па паразітарных хваробах жывёл. У працы «Фіксацыя цэстод у кішэчніку хрыбтовых» (1952) Р. С. Чабатароў паказаў, што цэстоды фіксуюцца ў арганізме гаспадара не толькі і столькі галоўкай, як гэта было прынята лічыць, а ўсёй стробілай, паказаны механізм гэтай фіксацыі. Гэта было пацверджана амерыканскімі даследчыкамі ў 1955 г. У гэты ж час у працы «Эпізааталогія і патагенез страўнікава-кішачных колік у коней» аўтар раскрывае прычыны з'яўлення колік у коней і прыходзіць да высновы, што ў сваёй большасці яны абумоўлены паразітарным фактарам — упершыню ім вывучаным і апісаным яшчэ ў 1945—1946 гг. вульгарным свайнікам.

Распрацоўваецца новы накірунак па выкарыстанні некаторых раслінаў — лубіну кармавога, канюшыны, эспарцэту, гарбуза і іншых пры паразітарных хваробах страўнікава-кішачнага тракту жывёл. Праводзіцца вывучэнне шэрагу пратазойных хваробаў жывёл — балантыдыёзу буйной рагатай жывёлы, трыхаманозу і амёбнай дызентэрыі свіней. Асаблівая ўвага надаецца вывучэнню паразітацэнозаў сельскагаспадарчых і свойскіх жывёл. Ім адкрыты шэраг заканамернасцяў дынамікі паразітацэнозаў і механізмы перадачы інвазійнага пачатку, што мае вялікае тэарэтычнае і практычнае значэнне.

Паглыбляюцца таксама навуковыя даследаванні па зоанозах, пры гэтым зноў звяртаецца ўвага на магчымасць заражэння чалавека кароставымі кляшчамі ад жывёл. Адкрыты ўзбуджальнікі амёбнай дызентэрыі свіней, балантыдыёзу буйной рагатай жывёлы, новыя прамежкавыя гаспадары макракантарынхаў. На аснове вывучэння этыялогіі, эпізааталогіі, патагенезу, распрацоўкі спосабаў ужывання новых прэпаратаў, у тым ліку выкарыстання буравугальнай смалы, прапануюцца ўдасканаленыя меры барацьбы з паразітарнымі хваробамі жывёл — піраплазмідозамі, трыхаманозам, балантыдыёзам; гельмінтозамі — парамфістаматыдозам, макракантарынхозам, параскарыдозам, странгілаідозам, а таксама пры каросце жывёл [8, 9]. У гэты ж час падрыхтаваны сцэнарый кінафільма «Дыктыякаулёз сельскагаспадарчых жывёл» з выкарыстаннем натуральных здымак доследаў аўтара. Распрацаваная Р. С. Чабатаровым сістэма мерапрыемстваў па барацьбе з паразітозамі жывёл шырока ўкаранялася ў пасляваенны перыяд у гаспадарках Украіны.

Дасканала вывучыўшы асаблівасці падрыхтоўкі ветэрынарных спецыялістаў, Р. С. Чабатароў звяртае ўвагу на недахопы ветэрынарнай адукацыі і прапануе канкрэтныя меры па яе паляпшэнні [11].

У красавіку 1959 г. Р. С. Чабатароў прызначаецца дырэктарам Беларускага навукова-даследчага ветэрынарнага інстытута і на гэтай пасадзе ён працуе да 1968 г., а ў Інстытуце — да 1976 г. У 1959 г. Р. С. Чабатароў выбіраецца акадэмікам Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі, а ў 1961 г.— акадэмікам АН БССР. У гэты час ён распрацоўвае канцэпцыю правядзення комплексных мер па барацьбе з паразітарнымі захворваннямі, для чаго лічыць неабходным «аб'яднаць намаганні медыцынскіх і ветэрынарных спецыялістаў, работнікаў асветы, камунальнай гаспадаркі і гандлю, падняць усю грамадскасць на выхаванне працоўных, выкарыстанне шкодных звычак». Гэта ён называе задачай вялікай дзяржаўнай важнасці (1963). У працы «Вызначэнне і сутнасць паразітызму» (1966) ён дае крытычны аналіз трактоўкі паняцця «паразітызм» айчыннымі і замежнымі вучонымі, звяртае ўвагу на важнасць

вывучэння паразітацэнозаў. У гэтай працы Р. С. Чабатароў дае азначэнне паняцця «паразітызм» і фармулюе шэраг законаў паразітызму.

Вялікую ўвагу Раман Сямёнавіч надае ўжыванню сучасных методык у вывучэнні паразітозаў і арганізацыі мераў барацьбы з імі. Шмат якія пытанні метадычных падыходаў пры вывучэнні паразітарных хваробаў ім паказаны ў працы «Методыка вывучэння паразіталагічнай сітуацыі і барацьба з паразітозамі сельскагаспадарчых жывёл» [10]. Гэты накірунак яго даследаванняў знапшоў сваё далейшае развіццё ў манаграфіі «Паразітозы сельскагаспадарчай жывёлы» [15]. У ёй аўтар абгрунтоўвае біялагічныя асновы паразіталогіі — фарміраванне паразітафауны вышэйшых хрыбетных, хваробатворны ўплыў паразітаў на арганізм жывёл і чалавека, крыніцы і шляхі заражэння чалавека і жывёл узбуджальнікамі паразітозаў, эпізаотый і эпідэмій паразітозаў, іх ачаговасць і іншыя. У гэтай манаграфіі ён таксама выкладае метадычныя падыходы пры вывучэнні паразітозаў, планаванне і правядзенне мераў барацьбы і прафілактыкі гэтых хваробаў, сярод якіх пашавая прафілактыка, ахова фермаў, кармоў і харчу ад забруджвання ўзбуджальнікамі паразітозаў, ізаляванае гадаванне маладняку жывёл, знішчэнне ўзбуджальнікаў паразітозаў у знешнім асяроддзі, павышэнне кваліфікацыі спецыялістаў і інш.

Бясспрэчную навуковую цікавасць уяўляе манаграфія Р. С. Чабатарова «Нарысы па гісторыі медыцынскай і ветэрынарнай паразіталогіі» [14], першае выданне якой было ў 1965 г. На падставе багатага літаратурнага матэрыялу аўтар даў рэтраспектыўны аналіз развіцця паразіталогіі са старажытнейшых часоў да канца XIX ст. У працы даюцца звесткі пра перыяд эмпірычнай паразіталогіі, фарміраванне даных пра ўзбуджальнікаў паразітозаў у Кітаі, Індыі, Егіпце, Старажытным Рыме і іншых краінах. У перыяд навуковай паразіталогіі (XV—XVIII стст.), паводле даных аўтара, адбываецца вывучэнне марфалогіі і біялогіі паразітаў, а таксама этыялогіі, патагенезу і клінічнага іх цячэння. Трэці раздзел кнігі прысвечаны развіццю паразіталогіі ў Расіі.

Другое выданне гэтай кнігі (1977) Р. С. Чабатароў дапаўняе матэрыяламі па фізіялогіі і біяхіміі гельмінтаў, у асобным раздзеле «Паразітозы чалавека і жывёл» змяшчаюцца матэрыялы пра патагенную ролю паразітаў, вучэнне Е. Н. Паўлоўскага пра прыродную ачаговасць хваробаў чалавека і жывёл, вучэнне Е. Н. Паўлоўскага пра паразітацэнозы, вучэнне акадэміка К. І. Скрабіна пра дэвастацыі, а таксама арыгінальныя даныя па клініцы, дыягностыцы, тэрапіі і прафілактыцы паразітаў [18].

Адна з найцікавейшых прац Р. С. Чабатарова, якая мае вялікую інфарматыўнасць і стала ў наш час бібліяграфічнай рэдкасцю,— гэта «Даведнік па ветэрынарнай і медыцынскай паразіталогіі» [17]. У ім аўтар сканцэнтраваў сапраўды энцыклапедычныя даныя пра асноўныя паняцці ў паразіталогіі, паказаў узбуджальнікаў паразітозаў, цыклы іх развіцця, тут пададзены звесткі пра лекавыя і прафілактычныя сродкі. Але найбольшую каштоўнасць, бясспрэчна, уяўляюць даныя пра айчынных і замежных паразітолагаў, якія ўнеслі важкі ўклад у развіццё сусветнай паразіталогіі [17].

Вялікая роля Р. С. Чабатарова не толькі як вучонага-даследчыка ў галіне паразіталогіі шмат па якіх арыгінальных накірунках, але і як педагога, папулярызатара навукі. Шмат часу ён аддаваў падрыхтоўцы навуковых кадраў. Пад яго непасрэдным кіраўніцтвам абаронена 10 кандыдацкіх дысертацый. Ён аўтар больш чым 160 друкаваных прац, мае два аўтарскія пасведчанні на вынаходствы [12, 13, 16].

Р. С. Чабатароў прымаў актыўны ўдзел у грамадскім жыцці. У даваенны і пасляваенны перыяды ён неаднаразова выбіраўся дэпутатам раённых Саветаў, быў членам Пленума секцыі жывёлагадоўлі і ветэрынарыі Заходняга аддзялення УАСГНІЛ, членам праўлення Усесаюзнага

таварыства паразітолагаў пры АН СССР, старшынёй Беларускага аддзялення УТВР.

Р. С. Чабатароў узнагароджаны медалём «За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.», медалём ВДНГ (1955 г.), ордэнам «Знак Пашаны» (1966 г.).

У памяці вучоных, спецыялістаў ветэрынарнага і медыцынскага профілю, усіх, хто ведаў Рамана Сямёнавіча Чабатарова, ён застаўся сціплым чалавекам, нястомным працаўнікам, адным з выдатнейшых вучоных і педагогаў у галіне паразіталогіі.

*М. В. ЯКУБОЎСКІ. Г. М. ДВОЙНАС*

## Пералік асноўных друкаваных прац акадэміка Р. С. Чабатарова

1. Чеботароў Р. С. Паразітарныя захворваньня буйнай і дробнай рагатой жывёлы. Менск, 1932.

2. Чеботарев Р. С. // Тр. ВИГ. М., 1935. Т. 1. С. 31—32.

3. Tschebotarjow R. S. // Tierärztliche Rundschau. 1935. N 11. S. 17—18.

4. Чеботарев Р. С. Зимове кліщування великої рогатої худоби та заходи боротьби з ними. Київ, 1937.

5. Чеботарев Р. С. // В помощь войсковому ветврачу: Справочник, 1944.

6. Чеботарев Р. С. Пироплазмоз лошадей. Киев, 1951.

7. Чеботарев Р. С. Комплексный метод боротьби з паразитарными захворюваннями сільскогосподарських тварин. Київ, 1953.

8. Чеботарев Р. С. // Основы ветеринарии: Учебник для зоотехнических вузов. Киев, 1958.

9. Чеботарев Р. С. Противопаразитарные свойства некоторых кормовых растений. Мн., 1960.

10. Чеботарев Р. С. и др. Методика изучения паразитологической ситуации и борьба с паразитозами сельскохозяйственных животных. Киев, 1961.

11. Чеботарев Р. С. Ветеринарная паразитология: Учебное пособие. Киев, 1962.

12. Чеботарев Р. С., Ратнер Ю. Б. Краткий паразитологический словарь. Мн., 1962.

13. Чеботарев Р. С. Мероприятия по борьбе с паразитозами. Мн., 1965.

14. Чеботарев Р. С. Очерки по истории медицинской и ветеринарной паразитологии (с древнейших времен до конца XIX в.). Мн., 1965.

15. Чеботарев Р. С. Паразитозы сельскохозяйственных животных. Методика изучения паразитологической ситуации и меры борьбы с паразитозами животных. Мн., 1965.

16. Чеботарев Р. С. // Инфекционные и паразитарные болезни сельскохозяйственных животных и птиц. Мн., 1964.

17. Чеботарев Р. С. Справочник по ветеринарной и медицинской паразитологии. Мн., 1971.

18. Чеботарев Р. С. Очерки по истории медицинской и ветеринарной паразитологии / Под ред. акад. Х. С. Горегляда. Мн., 1977.